

1. “Мінея” на ліпень 1691 г., выдадзеная ў г. Маскве, з праваслаўнай Успенскай царквы г. Браслава [9, арк. 110]



2. “Пяцідзясятніца” 1777 г., выдадзеная ў г. Маскве, з праваслаўнай царквы Божай Маці Адзігітрыі ў г.п. Дзісна Мёрскага раёна [2, арк. 72]



3. “Евангелле”, выдадзенае ў г. Вільні ў 1575 г., са стараабрадніцкай царквы ў в. Булаўнікі Браслаўскага раёна [12, арк. 23]



4. “Абіход”, выдадзены ў г. Маскве ў 1911 г., са стараабрадніцкай царквы ў в. Кукляны Пастаўскага раёна [15, арк. 56].


1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (далей – ДАВц). – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 1.
2. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 2.
3. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 4.
4. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 6.
5. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 7.
6. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 27.
7. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 28.
8. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 34.
9. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 39.
10. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 42.
11. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 44.
12. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 54.
13. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 55.
14. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 56.
15. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 61.
16. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 64.
17. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 66.


**Паўлава А.Я.**

## МАТЭРЫЯЛЫ АБ ДЗЕЙНАСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА АКАДЭМІЧНАГА ДРАМАТЫЧНАГА ТЭАТРА ІМЯ ЯКУБА КОЛАСА Ў ФОНДАХ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА АРХІВА-МУЗЕЯ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА

Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Я. Коласа з’яўляецца візітнай карткай г. Віцебска. Праз 3 гады тэатр адзначыць стогадовы юбілей. У 2009 г. выйшла манаграфія віцебскай мастацтвазнаўцы Т.В. Катовіч, напісаная з выкарыстаннем дакументаў ДАВВ. Між тым, асноўныя дакументальныя зборы аб коласаўскім тэатры знаходзяцца ў Мінску.

У зборах Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ) адклаўся комплекс крыніц аб дзейнасці тэатра і яго акцёраў. Гэта фонд самой установы (Ф.269), збор дакументаў кіраўніка бутафорскага цэха тэатра У.І. Кулікоўскага (Ф.336), фонд Беларускага тэатральнага таварыства (Ф.156), асабістыя фонды С. Акружнай, У. Куляшова, Л. Мазалеўскай, П. Малчанава, І.А. Матусевіча, Ц. Сяргейчыка, А. Труса, Ф. Шмакава, К. Саннікава і С. Казіміроўскага. Колькасць крыніц перавышае 1600 архіўных спраў за перыяд з 1927 па 2014 год. Гэта справаводчыя дакументы, асабістыя творчыя і біяграфічныя матэрыялы артыстаў. Дапаўняюць сведчанні афіцыйных дакументаў адклаўшыяся ў архіўных зборах афіцы і праграммы спектакляў тэатра, пачынаючы 1947 г. Асаблівасцю прыгаданых фондаў з'яўляецца наяўнасць у зборах публікацый СМІ, прысвечаных дзейнасці тэатра, аналізу пастановак, аповяду пра рэжысёраў і акцёраў.

У архіўным фондзе тэатральнай установы даследчыкі могуць пазнаёміцца з дакументамі пачатковага перыяду дзейнасці тэатра. Гэта пастановы дырэкцыі тэатра аб фарміраванні штатнага складу, умовы аб продажу квіткоў на спектаклі, дамовы з аўтарамі музыкі і мастацкага афармлення спектакляў “Простыя сэрцы” і “Маёмасць” У складзе фонда знаходзіцца экземпляр п'есы С. Разанава “Маёмасць” [22, арк. 1–96 ].

З дакументаў вынікае, што кіраўніцкая структура тэатра складвалася няпроста. Прычынай канфлікта сталі супрацьлеглыя пазіцыі мастацкага кіраўніка тэатра С. Хачатурава і дырэкцыі ўстановы. Дырэкцыю тэатра непакоіла выступленне мастацкага кіраўніка супраць выездных спектакляў і нежаданне яго натхняць акцёраў працаваць над паляпшэннем сваёй беларускай мовы. Вырашэннем гэтага канфлікту стала прыняцце пастановы дырэкцыі аб скасаванні пасады мастацкага кіраўніка [21, арк.7, 24–31].

Дзейнасць тэатра не спынялася і ў ваенныя гады. У архіўным зборы адкlаліся каляндарныя планы паказу спектакляў і канцэртаў за 1941 г. падчас знаходжання тэатра ў эвакуацыі ў г. Уральску і ў Арэхава-Зуеве ў 1944г. Жыхары Уральска ўбачылі пастаноўкі “Несцерка”, “Не ўсё кату Масленіца”, “Лекар па няволі”, “Хлопец з нашага горада”, “Выпрабаванне агнём”, “Фронт”. Як пазначана ў сшытку каляндарнага плана, усе спектаклі праходзілі “тэхнічна чыста”, зрэдку адбываліся спазненні з пачаткам, выкліканыя абставінамі ваеннага часу [23, арк. 1–22; 24, арк. 1–67 ].

На працягу ўсёй гісторыі дзейнасці на пляцоўках тэатра шанавалі традыцыі, ўважліва ставіліся да нацыянальнай драматургіі, ішлі насустрач маладым пісьменнікам і драматургам, акцёрам, тэатральным мастакам і кампазітарам, смела эксперыментавалі. Матэрыялы паседжаняў мастацкага савета тэатру, перапіскі з Міністэрствам культуры, каляндарныя планы работы, рэцэнзіі спецыялістаў і газетныя публікацыі сведчаць пра тэматычную і жанравую разнастайнасць спектакляў. Перавагай пры выбары п'ес для пастаноўкі карысталіся творы, заснаваныя на беларускім фальклоры, інсцэніроўкі літаратурных твораў беларускіх аўтараў ці пастаноўкі на гістарычную тэматыку.

Літаральна напярэдадні вайны ў тэатры адбылася прэм'ера спектакля “Несцерка”, які на дзесяцігоддзі стане візітнай карткай коласаўскага тэатра. Пастаўлены Н.Б. Лойтарам спектакль адрозніваўся сваімі яркімі фарбамі, паэтычнасцю, музычнасцю, дынамізмам. У зборы У.І. Кулакоўскага захавалася фота макета дэкарацый да першых спектакляў “Несцеркі”, зробленыя мастаком Л.Ю. Кролем [40, арк. 1 ]. У спектаклі была занята практына ўся трупа. У тэатры прыкладалі намаганні, каб зберагчы матэрыялы і ўспаміны аб першай пастаноўцы спектакля. Аб гэтым сведчыць напісаны напярэдадні 40-годдзя ўстановы ліст кіраўніцтва тэатра да родных Н.Б. Лойтара з просьбай аб прадастаўленні дакументатаў за ваенны перыяд [19, арк. 27]. Артысты працавалі над удасканаленнем спектакля. Вядучыя майстры сцэны выказвалі свае заўвагі аб недапушчальнасці пeратварэння музычнай народнай казкі-свята ў звычайную бытавую камедыю і неабходнасці ўдасканалення выканання роляў маладымі артыстамі [10, арк. 3–10].

Інсцэніроўку коласаўскага “На ростанях” пад назвай “Навальніца будзе” у пасляваенныя дзесяцігоддзі можна таксама назваць адной з візітных картак тэатра. Гэтую п'есу А. Звонака трупа неаднарозова прадстаўляла на гастролях па гарадах СССР, у тым ліку ў Крамлёўскім тэатры [38, арк. 5, 7]. Даволі ўдалым атрымаўся спектакль “Крыніцы” па твору І. Шамякіна, у якім быў задзейнічаны вялікі калектыў, уключаючы аўтара музыкі І. Пагаўкіна і тэкстаў Я. Шагана [38, арк. 2]. Да афіцыйных мерапрыемстваў з нагоды 40-годдзя тэатра трупа падрыхтавала спектакль “Бацькаўшчына” паводле К. Чорнага, рэжысёрам якога выступіў выдатны майстар сцэны Ф. Шмакаў. Дзеля прем'еры “Бацькаўчыны”, нават крыху пераносілі святкаванне [15, арк. 30 ].

Менавіта коласаўцам вопытныя і маладыя беларускія драматургі і літаратары аддавалі права першай пастаноўкі спектакляў – “Блытаныя сцежкі” ( К. Крапіва), “Парог” (А. Дудараў), “Востраў Алены” (Я. Шабан), “Хуткія цягнікі” (А. Папова), “Трывога” (А. Петрашкевіч) [29, арк. 3; 38, арк. 11].

Коласаўцы неаднаразова браліся за сцэнічна складаныя пастаноўкі. Купалаўцы не знайшлі ключ для пераноса твора У. Караткевіча “Кастусь Каліноўскі” на тэатральную сцэну. Рэжысер В.

Мазынскі вырашыў спектакль як паэтычную легенду аб К. Каліноўскім. Сярод дакументаў архіўнага збора захавалася станоўчая рэцэнзія А. Саннікава на спектакль [1, арк. 19–21].

Тэматыка Вялікай Айчыннай вайны, барацьбы супраць ворагаў заўсёды прысутнічала на сцэне тэатра. У 1956 г. коласаўцы ажыццявілі пастаноўку п'есы "Крэпасць над Бугам" [14, арк. 1]. На 1968 г. тэатр запланаваў пастаноўку п'есы А.М. Маўзона аб Віцебскі падполлі (ва ўсіх дакументах фонда п'еса падаецца без назвы). Галоўным пытаннем было вызначыцца, у якім жанры ставіць гэты твор. Ц. Сяргейчык адзначыў, што "канкрэтнымі падзеямі гледачоў ўжо не здзівіш". Ён прапанаваў паставіць спектакль як аповяд пра падзеі мінулага з пазіцыі дня сучаснага і стварыць спектакль-канцэрт [20, арк. 5–8].

Пісьменнік Б. Васільеў не разлічваў на тэатр, калі ствараў сваю аповесць "А досвіткі тут ціхія...". Б. Эрын выдатна ведаў спецыфіку тэатра і галоўныя падзеі твора, што дазволіла яму зрабіць спектакль яркім і драматычным творам. С.П. Петровіч адзначыў у сваёй рэцэнзіі, што на вышыні аказаўся увесь пастановачны калектыў тэатра". Тэатральныя крытыкі і журналісты вельмі станоўча выказваліся аб выканаўцы ролі Галі Чэтвертак маладой С. Акружнай [5, арк. 1–6; 46, арк. 7]. Работу мастака А. Салаўёва па афармленню пастаноўкі прызналі лепшым прыкладам, калі тэатральны мастак цалкам падпарадкоўвае сабе задуме рэжысёра [5, арк. 1–6].

У 1955 г. М.А. Міцкевічам была пастаўлена лірычная камедыя па п'есе В. Губарэвіча і І. Дорскага "Алазанская даліна". Як сведчылі рэцэнзіі, у пастаноўцы адзначыліся як "зоркі" тэатра, так і маладыя артысты. Гледачы знаходзілі ў героях камедыі лепшыя свае якасці і ўдзячна рэагавалі па падзеі на сцэне [39, арк. 2]. Узаемаадносіны паміж прадстаўнікамі былых ваюючых краін прадставілі ў пастаноўцы "Салаўіная ноч"... Як сведчыць рэакцыя крытыкаў, у гэтым спектаклі таксама вызначыўся талент актрысы С. Акружнай [3, арк.1–3; 44, арк.1].

Руская класіка рэгулярна прысутнічала ў рэпертуары тэатра. Тэксты рэцэнзій і высноў мастацкага савета падцвярджаюць, што яскравым спектаклем атрымаўся "Клоп" па У. Маяковскому [2, арк. 1; 20, арк. 19–25]. У той жа час, да пастаўленага У. Мазынскім "Вішнёвага саду" па А.П. Чэхаву крытыкі выказвалі шматлікія прэтэнзіі [29, арк.7].

Калектыў тэатра ажыццяўляў і пастаноўкі твораў замежных аўтараў. У другой палове 1940-х аўтарскаму калектыву начале з рэжысёрам Р. Осіпавым атрымалася паставіць спектакль "Овад" Э. Войніча [38, арк. 1]. У зборы тэатра захаваўся ліст галоўнага рэжысёра А. Падабеда за 1966 г. у Міністэрства культуры з прапановай перакласці на беларускую мову і паставіць п'есу Р. Тома " Восемь закаханых жанчын" [19, арк. 30]. І тэатр ажыццявіў гэтую пастаноўку, але пазней – у 1977 г. Падчас гастроляў у Браславе артысты прадставілі на суд гледачоў драму Ю. О'Ніла – "Любоў да зямлі" [29, арк. 10].

Наколькі сур'ёзна ў тэатры ставіліся да выпуску кожнага спектакля, якімі складанымі былі рэжысёрскія і акцёрскія пошукі, можна даведацца, чытаючы пратаколы пасяджэнняў мастацкага савета. У фондзе тэатра захаваліся ўсе пратаколы паседжанняў, пачынаючы з 1947 г. Сярод пратаколаў захаваліся матэрыялы аб абмеркаванні генеральнай рэпетыцыі і прыёме спектакля "Дурачка" па творы Лопе де Вега. Спектакль прынялі да пастаноўкі, пры гэтым адзначылі, што бліскучае афармленне, прывабная музыка і граматная работа рэжысёра з цікавымі мізансцэнамі на момант здачы пастаноўкі і "выратавалі" яе [20, арк. 1–4].

Спектаклі для маленькіх гледачоў таксама прысутнічалі ў рэпертуары коласаўцаў. Перапіска з Міністэрствам культуры БССР і водгукі крытыкаў сведчаць аб удалых пастаноўках "Дзімка-невідзімка", "Аленькая кветачка" і "Прынцэса і дрывасек" [1, арк. 2–3; 4, арк. 1–3; 25, арк. 4].

На гастролі па традыцыі вывозілі беларускія пастаноўкі паводле класічных твораў і на сучасную тэматыку, рускую класіку і інсцэніроўку аднаго з аўтараў рэспублік СССР [19, арк. 36; 29, арк. 2; 45, арк.1–7 ].

У савецкі перыяд звычайнай была сувязь устаноў культуры з прадпрыемствамі прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Акцёры паказвалі парадка 600 выяздных пастановак штогадова. У Віцебску існавала традыцыя вызначаць на прадпрыемствах горада дзень тыдня для наведвання спектакля на асноўнай сцэне ці прагляду выязной пастаноўкі. У тэатры маніторылі сітуацыю з наведваннем спектакляў работнікамі прадпрыемстваў і устаноў горада, звярталася ўвага на колькасць маладых гледачоў. Так, студэнты і супрацоўнікі Віцебскага педагагічнага інстытута актыўна наведвалі спектаклі. На сцэне тэатра рэгулярна ажыццяўляюцца пастаноўкі па творах са школьнай праграмы па рускай і беларускай літаратуры [18, арк. 1–10]. Але дырэктар тэатра І. Дорскі пазначаў горана на недастатковы узровень увагі да наведвання спектакляў школьнікамі.

Эстэтычны ўзровень гледача можа паскорыць ці замарудзіць рост тэатральнага калектыву. Кіраўніцтва тэатра клапацілася аб працы з гледачамі. У 1972 г. пры тэатры быў створаны Універсітэт тэатральнага мастацтва. Спачатку слухачамі ўніверсітэта былі прадстаўнікі адміністратыўнага актыву горада. Паступова далучыліся простыя жыхары, студэнты і навучэнцы.

Штогадова заняткі наведвалі больш за тысячу слухачоў. Праграмы заняткаў прадугледжвалі прагляд і абмеркаванне спектакляў, сустрэчы з майстрамі сцэны, рэжысёрамі, драматургамі і мастацтвазнаўцамі. Тэатр арганізоўваў філіялы ўніверсітэта ў Полацку, Наваполацку і Оршы [28, арк.42; 44, арк.4].

Дакументы аб штодзенных клопатах і працоўных буднях тэатра таксама адклаліся ў архіўным зборы [17, арк. 10–12 ]. Захаваліся планы-расклады работы па месяцах: рэпетыцыі, расклад спектакляў на асноўнай сцэне і выяздных выступленняў. З планаў вынікае, што ў дзень без спектакляў для артыстаў праводзіліся творчыя семінары і лекцыі [19, арк. 29; 27, арк.7]. У складзе фонда прадстаўлены справаздачы аб камандзіроўках прадстаўнікоў тэатра ў народныя тэатры вобласці з мэтай высвятлення ўзроўню іх творчасці [17, арк. 32–34].

Кіраўніцтва тэатра клапацілася аб папаўненні трупы тэатра маладымі артыстамі. У архіўным зборы захаваліся матэрыялы аб дзейнасці у 1950-я гады пры ўстанове тэатральнай студыі. Як вынікае з нататкаў артысты тэатра, што выкладалі ў студыі, ўважліва ставіліся не толькі да асабістых фізічных якасцяў студыйцаў, але і да сумленнасці падыхода да заняткаў у студыі. Ц. Сяргейчык пазначаў у характарыстыках, што некаторыя фізічныя асаблівасці могуць перашкодзіць навучэнцам стаць акцёрамі, але пры сумленным падыходзе, з такіх студыйцаў могуць атрымацца кіраўнікі самадзейнасці [26, арк. 706].

У 1961 г. дырэктар тэатра І. Дорскі звярнуўся да міністра з просьбай размеркаваць у тэатр 10 выпускнікоў тэатральна-мастацкага інстытута. Дырэктар падмацаваў сваю просьбу згодай перанесці на сцэну тэатра 3 дыпломных спектакля выпускнікоў і дамоўленасцю з Віцебскім гарвыканкамам аб выдзяленні для маладых артыстаў 2 кватэр. І моладзь не падвяла. Праз некалькі гадоў маладыя артысты ў вольны ад працы час пераклалі на беларускую мову, афармілі, адрэпетыравалі і выпусцілі спектакль "Беласнежка і сем гномаў". Падчас зімовых канікул спектакль быў паказаны маленькім гледачам 14 разоў. З гэтай нагоды дырэктар тэатра звяртаўся ў міністэрства з просьбай матэрыяльна заахвоціць маладых артыстаў [19, арк. 34].

З нагоды набліжэння стогадовага юбілея ў даследчыкаў могуць выклікаць цікавасць матэрыялы пра падрыхтоўку святкавання 40-годдзя. У тым юбілейным сезоне коласаўцы ўзбагацілі рэпертуар па некалькіх тэматычных кірунках. У тэатры былі пастаўлены "Сэрца на далоні" І. Шамякіна, "Жаркае лета ў Берліне" Д. К'юсак, "Трое з неба" Рабкіна. Былі адноўлены лепшыя спектаклі тэатра "Несцерка" В. Вольскага і "Лявоніха" П. Данілава. Артысты тэатра праехалі па рэгіёнах рэспублікі з творчай справаздачай. Да юбілея былі выпушчаны вялікая брашура і рэкламны ролік, падрыхтаваны шэраг перадач на ТБ і радыё [19, арк. 5–21].

Не меньш цікавымі з'яўляюцца матэрыялы асабістых фондаў акцёраў. Практычна ўсе асабістыя зборы акумулююць у сабе багаты фоталетапіс аб творчай дзейнасці, матэрыялы працы над ролямі, публікацыі СМІ аб пастаноўках тэатра, рэцэнзіі на спектаклі. Так, у фондзе А.М. Труса адклаліся матэрыялы аб 110 сыграных ім ролях. У фондзе Ф. Шмакава захаваліся крыніцы аб працы акцёра над ралямі Лемяшэвіча з п'есы "Крыніцы" і Эдгара з "Караля Ліра" [30, арк. 1–19; 31, арк. 1–16]. У адзінках захавання сабраны фотаздымкі са сцэнамі спектакляў. "Шукальнікі", "Кароль Лір", "Чатыры крыжы на сонцы" і інш. [32, арк. 1; 33, арк. 1]. У зборы знаходзяцца фота Ф.І. Шмакава ў вобразе Леніна са спектакля "Шостае ліпеня" паводле твора М.Ф.Шатрова [34, арк. 1–7]. Сярод фотаматэрыялаў фонда можна азнаміцца з кадрамі са спектакля "Трывога" паводле п'есы А. Петрашкевіча, пры пастаноўцы якога Ф. Шмакаў выступіў рэжысёрам [35, арк. 24]. Карысным для маладых даследчыкаў можа стаць аўтограф артыкула М. Маноліна "Выбар быў правільным" аб станаўленні і творчым шляху Ф. Шмакава і артыкул Р. Смольскага аб п'есах маладых драматургаў і іх пастаноўцы коласаўцамі [37, арк. 1–4; 38, арк.11].

У асабістым зборы С. Акружнай захаваліся фотаздымкі са спектакляў за перыяд с 1969 па 1986 г.: "А досвіткі тут ціхія…" паводле Б.Васільева, "Зацюканы апостал" паводле А. Макаёнка, "Ах,які пасаж" паводле У. Салагуба і інш. [41; 42; 43; 44, арк. 2–3, 11; 45, арк. 6.].

Цікавымі для мастацтвазнаўцаў будуць матэрыялы фонда Ц.М. Сяргейчыка. Акрамя фотаздымкаў і тэкстаў роляў, у гэтым асабістым зборы можна азнаёміцца з шматлікімі заўвагамі артыста і рэжысера да спектакляў "Несцерка" і "Зацюканы апостал" [10, арк. 3–9; 11, арк. 3–9]. Гэты комплекс зберагае аўтарскі рэжысёрскі экземпляр п'есы "Ірынка" і пастановачны план п'есы Э. Ранета "Блудны сын" [6, арк. 1–47; 7, арк. 1–67]. Цікавасць дследчыкаў могуць выклікаць доклад Ц. Сяргейчыка на святочным паседжанні з нагоды 40-годдзя тэатра [6, арк. 1–92; 12, арк. 1–14]. У асабістым фондзе захоўваюцца матэрыялы аб калегах па тэатру: аўтограф артыкула аб Я. Глебоўскай і артыкул у "ЛіМ" пра А. Радзялоўскую [8, арк. 16; 9, арк. 1–5]. У зборы І.А. Матусевіча адклаліся асабістыя ўспаміны фондаўтваральніка пра А. Радзялоўскую [13, арк. 1].

Такім чынам, комплекс дакументаў і матэрыялаў, што зберагаецца ў БДАМЛМ, з'яўляецца каштоўнай крыніцай аб творчых поспехах і эксперыментах аднаго з лепшых театраў краіны. Прыгада-

ныя матэрыялы могуць дадаць шмат цікавых штрыхоў ў творчы летапіс Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа і яго акцёраў і дапоўніць збор Віцебскага абласнога краязнаўчага музея.


1. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (далей – БДАМЛМ). – Ф. 129. Воп. 1. Спр. 119.
2. БДАМЛМ. – Ф. 156. Воп. 1. Спр. 365.
3. БДАМЛМ. – Ф. 156. Воп. 1. Спр. 372.
4. БДАМЛМ. – Ф. 156. Воп. 1. Спр. 376.
5. БДАМЛМ. – Ф. 156. Воп. 1. Спр. 797.
6. БДАМЛМ. – Ф. 212. Воп. 1. Спр. 1.
7. БДАМЛМ. – Ф. 212. Воп. 1. Спр. 3.
8. БДАМЛМ. – Ф. 212. Воп. 1. Спр. 166.
9. БДАМЛМ. – Ф. 212. Воп. 1. Спр. 168.
10. БДАМЛМ. – Ф. 212. Воп. 1. Спр. 173.
11. БДАМЛМ. – Ф. 212. Воп. 1. Спр. 174.
12. БДАМЛМ. – Ф. 212. Воп. 1. Спр. 227.
13. БДАМЛМ. – Ф. 251. Воп. 1. Спр. 75.
14. БДАМЛМ. – Ф. 269. Воп. 1. Спр. 46.
15. БДАМЛМ. – Ф. 269. Воп. 1. Спр. 47.
16. БДАМЛМ. – Ф. 269. Воп. 1. Спр. 86.
17. БДАМЛМ. – Ф. 269. Воп. 1. Спр. 109.
18. БДАМЛМ. – Ф. 269. Воп. 1. Спр. 156.
19. БДАМЛМ. – Ф. 269. Воп. 1. Спр. 173.
20. БДАМЛМ. – Ф. 269. Воп. 1. Спр. 187.
21. БДАМЛМ. – Ф. 269. Воп. 1. Спр. 668.
22. БДАМЛМ. – Ф. 269. Воп. 1. Спр. 670.
23. БДАМЛМ. – Ф. 269. Воп. 1. Спр. 677.
24. БДАМЛМ. – Ф. 269. Воп. 1. Спр. 683.
25. БДАМЛМ. – Ф. 269. Воп. 1. Спр. 704.
26. БДАМЛМ. – Ф. 269. Воп. 1. Спр. 706.
27. БДАМЛМ. – Ф. 269. Воп. 1. Спр. 717.
28. БДАМЛМ. – Ф. 275. Воп. 1. Спр. 42.
29. БДАМЛМ. – Ф. 275. Воп. 1. Спр. 50.
30. БДАМЛМ. – Ф. 285. Воп. 1. Спр. 1.
31. БДАМЛМ. – Ф. 285. Воп. 1. Спр. 2.
32. БДАМЛМ. – Ф. 285. Воп. 1. Спр. 18.
33. БДАМЛМ. – Ф. 285. Воп. 1. Спр. 20.
34. БДАМЛМ. – Ф. 285. Воп. 1. Спр. 21.
35. БДАМЛМ. – Ф. 285. Воп. 1. Спр. 24.
36. БДАМЛМ. – Ф. 285. Воп. 1. Спр. 28.
37. БДАМЛМ. – Ф. 285. Воп. 1. Спр. 44.
38. БДАМЛМ. – Ф. 285. Воп. 1. Спр. 47.
39. БДАМЛМ. – Ф. 285. Воп. 1. Спр. 89.
40. БДАМЛМ. – Ф. 336. Воп. 1. Спр. 36.
41. БДАМЛМ. – Ф. 337. Воп. 1. Спр. 2.
42. БДАМЛМ. – Ф. 337. Воп. 1. Спр. 3.
43. БДАМЛМ. – Ф. 337. Воп. 1. Спр. 5.
44. БДАМЛМ. – Ф. 337. Воп. 1. Спр. 11.
45. БДАМЛМ. – Ф. 337. Воп. 1. Спр. 12.
46. БДАМЛМ. – Ф. 337. Воп. 1. Спр. 13.
47. БДАМЛМ. – Ф. 337. Воп. 1. Спр. 14.


**Денисов М.Н.**

## ДОКУМЕНТЫ ЦНА НАН БЕЛАРУСИ КАК ИСТОЧНИК ПО ИСТОРИИ ПРОМЫШЛЕННОГО РАЗВИТИЯ БЕЛАРУСИ В 1944–1991 ГГ.

Одним из важнейших показателей состояния экономики страны, является её индустриальное развитие, не последнюю роль в котором играет наука. Научные разработки позволяют оптимизировать различные сферы производства с целью получения оптимального количества товаров, при уменьшении количества затрачиваемых ресурсов на их разработку. Именно поэтому важно развивать сеть научных организаций и институтов, которые могли бы заниматься разработкой и внедрением в производство новых технологий, а также готовить кадры, способные ими управлять.

Процесс создания подобных организаций на территории Беларуси начался ещё в 1920-е гг., однако наибольшего развития их сеть достигла уже в послевоенные годы. Деятельность научных организаций БССР в 1944–1991 гг. нередко становилась темой для различного рода исследований, в рамках которых исследователями был выработан ряд методик, основанных на изучении документальных материалов научных организаций, именно об этих материалах и пойдёт речь в данном исследовании.

Цель исследования – дать обзорную характеристику документов, хранящихся в Центральном научном архиве Национальной академии наук Беларуси, и определить их значение в изучении связей науки и промышленности БССР в 1944–1991 гг.

Архив академии наук был организован в начале 1930-х гг., являясь попеременно структурным подразделением Фундаментальной библиотеки АН БССР и Аппарата Президиума АН БССР. В 1987 году архив в качестве самостоятельного научно-методического подразделения вошёл в структуру Института истории. С 2021 года входит в состав Центра истории науки и архивной работы Института истории НАН Беларуси. Большая часть документов архива представлена планами и отчетами институтов, других учреждений и подразделений Аппарата Президиума академии наук, а также коллекцией личных дел сотрудников (академиков, член-корреспондентов, научных и технических сотрудников, аспирантов), насчитывающей более 20000 единиц хранения [3].

Большинство организаций и подразделений АН БССР, занимавшихся промышленными проектами, входили в состав Отделения технических наук [4, л. 18–28], отдельно в ряду данных организаций стоит отметить Институт экономики, находящийся в составе Отделения гуманитарных наук. Несмотря на это, указанный Институт играл важнейшую роль в научных исследованиях в сфере развития промышленности [5, л. 22].

Деятельность учреждений АН БССР охватывала широкий круг исследований, наиболее значимыми из которых являются следующие: выявление новых путей научно-технического прогресса, разработка рекомендаций по использованию результатов научных исследований на практике, разработка и осуществление научно-технических и экономических программ, научное обоснование добычи и использования природных ресурсов в промышленности и энергетике, исследования